

THE ULTIMATES
ISSUE
4
ГРОМ
COMICS .BY
КОМІКСЫ ПА-БЕЛАРУСКУ
THE ULTIMATES #04
(2002)
ПЕРАКЛАД
І АФАРМЛЕННЕ:
COMICSBY.BY
MARVEL
(c) 2010 Marvel Characters, Inc. All rights reserved.
WWW.MARVEL.COM


# THE ULTIMATES


## 4. Гром











LIVE
НЕСУМНЕЎНА, Я СПЫТАЎ СЯБЕ, КАЛІ Б Я БЫЎ КІРАЎНІКОМ САМАЙ ПАСПЯХОВАЙ КАМПАНІІ «СТАРК ІНТЭРНЭЙШНЛ», ШТО МНЕ РАБІЦЬ У КАМАНДЗЕ АЛЦІМЭЙТС, АЛЕ Я ЛІЧУ, ШТО МЕНАВІТА ВЫ АДКАЖАЦЕ НА МАЁ ПЫТАННЕ, ТОНІ.
Я МАЮ НА ЎВАЗЕ, ВОСЬ ЯНА КАМАНДА, ТОЛЬКІ МЕСЯЦ НАЗАД З'ЯВІЛАСЯ, А ВЫ ЎЖО АДПРАЎЛЕНЫ НА 2 ТЫДНЯ Ў КОСМАС НА КАСМІЧНЫМ КАРАБЛЕ.
З УСЁЙ ПАВАГАЙ, АЛЕ ГЭТА САМЫ ВАР'ЯЦКІ АРГУМЕНТ, ЯКІ Я КАЛІ-НЕБУДЗЬ ЧУЎ, ЛАРЫ. А ЦІ НЕ ТАМУ ГЭТА, ШТО ВЫ АДМОВІЛІСЯ АД МЕДЫЦЫНСКАЙ СТРАХОЎКІ, ТАМУ ШТО НАВАТ УЯВІЦЬ НЕ МОЖАЦЕ СЯБЕ ХВОРЫМ?
ДОБРА, АДНОСНА ГЭТАЙ ЗАЯВЫ – ІДЭЯ АБ ПАГРОЗЕ СУПЕРЗЛОДЗЕЯ БЫЛА ВЫКЛІКАНА ТОЛЬКІ ВАШЫМІ ЦІКАВАСЦЯМІ Ў СМІ І ВЫ ТОЛЬКІ ПЕНІЦЕСЯ АД УСІХ БУЙНЫХ КАНТРАКТАЎ З УРАДАМ?
LIVE
ДОБРА, ДЛЯ ПАЧАТКУ, ІДЭЯ З ШАТЛАМ ДЛЯ ДНЯ НАРОДЗІНАЎ ШЭНАН БЫЛА ЗАДУМАЛА ВЕЛЬМІ ДАЎНО І, ШТО Б НІ ПІСАЛІ ГЭТЫЯ ПІСАКІ, Я НЕ ЛЮБЛЮ РАСЧАРОЎВАЦЬ ТАКІХ МІЛЕНЬКІХ АКТОРАК.
ТАДЫ, КАНЕШНЕ Ж, ЁСЦЬ ПРАБЛЕМЫ З ПОШУКАМ ЗВЫШЛЮДЗЕЙ ДЛЯ ВАШАЙ ДЗІЎНАЙ КАМАНДЫ ВЫРАТАВАННЯ.
ПРАЎДА, ШТО, НЯГЛЕДЗЯЧЫ НА НАЯЎНАСЦЬ КАПІТАНА АМЕРЫКА НА БОРЦЕ, НІ АДЗІН З ВАШЫХ ДВАЦЦАЦІ ТЫСЯЧ ТЭХНІКАЎ НЕ Ў СТАНЕ ПАЎТАРЫЦЬ СТАРУЮ СЫРОВАТКУ СУПЕРСАЛДАТА, ЯКАЯ ЦЯЧЭ Ў ЯГО КРЫВІ?
LIVE
ПА-ДРУГОЕ, З ДЗЕСЯЦІ ГАДОЎ Я ПРАЦАВАЎ ПА ВАСЕМНАЦЦАЦЬ ГАДЗІН У СУТКІ, І ТАМУ Я НЕ МАГУ СЯДЗЕЦЬ І ВАЛЯЦЬ ДУРНЯ – МНЕ АБАВЯЗКОВА ТРЭБА ЧЫМ-НЕБУДЗЬ ЗАЙМАЦЦА.
ШТО Ж, АДКАЖУ НА ТВАЁ ПЕРШАЕ ПЫТАННЕ: ЛЮДЗІ, ЯКІЯ САБРАЛІСЯ ТУТ, ГЭТА ТЫЯ, ХТО ЎЖО ПАДПІСАЎ СВАЁ ЖЫЦЦЁ НА БАРАЦЬБУ СА ЗЛОДЗЕЯМІ Ў САМАЙ НЕБЯСПЕЧНАЙ ПРАЦЫ Ў СВЕЦЕ, ЛАРЫ.
ЯК МЫ КАЗАЛІ ЎЖО РАНЕЙ, МЫ ВЯДЗЕМ ПЕРАМОВЫ З НАРВЕЖСКІМ БОГАМ ТОРАМ, І ХЭНК ПІМ УЖО ПРАЦУЕ НАД ШТУЧНЫМ РОЗУМАМ З ЭКСТРА-НАРМАЛЬНЫМІ ЗДОЛЬНАСЦЯМІ.
LIVE
АЛЕ ВЫ НЯ ДУМАЛІ, ШТО Ў ВАС ЗАРАЗ НЯМА НЕАБХОДНАСЦІ, ТОНІ? УСЕ ГЭТЫЯ ГРОШЫ, ЯКІЯ ВЫДАЮЦЬ ДЛЯ РАЗВІЦЦЯ СІЛАЎ ЗВЫШЛЮДЗЕЙ СТВАРАЮЦЬ МОЦНАЕ ТРЭННЕ З ВАЙСКОВЫМ КІРАЎНІЦТВАМ.
ВЫ ШТО, СУР'ЁЗНА ВЫЛУЧЫЛІ 50 МІЛІЯРДАЎ ДАЛЯРАЎ НА АДНАЎЛЕННЕ ЎЗБЯРЭЖЖА МАНХЭТТАНА ПАСЛЯ ЎСЯГО ТОЛЬКІ АДНАГО НАПАДЗЕННЯ СУПЕРЗЛОДЗЕЯ?
А ШТО, КАЛІ ЗА БЛІЖЭЙШЫЯ ДЗЕСЯТ ГАДОЎ З'ЯВІЦЦА ЯШЧЭ ХТО-НЕБУДЗЬ, НАКШТАЛТ МАГНЕТА? ЦІ ГЭТА ЗНОЎ БУДЗЕ ЁН?
АДНОСНА СУПЕРСАЛДАТА... КАНЕШНЕ, МЫ РАСЧАРАВАНЫ, ШТО ДОКТАР БАНЭР НЕ ПРАД'ЯВІЎ РЭЗУЛЬТАТАЎ, БО КАПІТАН АМЕРЫКА З'ЯЎЛЯЕЦЦА САМЫМ НЕБЯСПЕЧНЫМ ЖЫВЫМ ЧАЛАВЕКАМ.
ВЫ СУР'ЁЗНА ЛІЧЫЦЕ, ШТО НАМ НЕАБХОДНА МЕЦЬ ДВУХ ТАКІХ ХЛОПЦАЎ, КАБ ПЕРАМАГЧЫ Ў БІТВЕ?


Нью-Ёрк:
ДЗЯКУЙ ЗА ТОЕ, ШТО ДАПАМАГЛА МНЕ АПРАНУЦЦА, ДЖЭН. ТЫ, НАПЭЎНА, ВЕДАЕШ УСЁ ПРА ПАКУПКІ І КРАМЫ З АДЗЕЖАЙ.
НУ, МАЯ МАЦІ БЫЛА ДЫЗАЙНЕРАМ, ТАМУ ПАХОДЫ ПА КРАМАМ У МЯНЕ Ў КРЫВІ, КЭП. АКРАМЯ ТАГО, МНЕ БЫЛО Б НЕВЫНОСНА ГЛЯДЗЕЦЬ НА ЦЯБЕ Ў АБТРАПАНЫМ КАПЕЛЮШЫ І Ў БРУКАХ КЛЁШ.
СПАДЗЯЮСЯ, ТВОЙ МУЖ НЕ БУДЗЕ ЗЛАВАЦЦА НАКОНТ ТАГО, ШТО ТЫ МАРНУЕШ ЧАС З СУМНЕЎНАГА ВІДУ ТЫПАМ.
НУ ШТО ТЫ! ДВА КАПУЧЫНА І ПАХОД ПА КРАМАХ – ГЭТА ЦЯЖКА НАЗВАЦЬ НАГОДАЙ ДЛЯ РАЗВОДА Ў НАШЫЯ ДНІ. ТЫ БОЛЬШ НЕ Ў СОРАК ПЯТЫМ, ГЛУПЕНЬКІ.
OUT
ПАТЛУМАЧ-КА: 250 ТОРБАЎ ДЛЯ ПАРЫ ШМАЦЦЯ? Я НЕ РАБІЎ ТАКОГА НАВАТ ПРАЗ ШЭСЦЬ МЕСЯЦАЎ, КАЛІ ЎПЕРШЫНЮ ДАЛУЧЫЎСЯ ДА АРМІІ.
ВЕДАЕШ, ТЫ МЯНЕ ЗДЗІЎЛЯЕШ, МІСТАР КАПІТАН АМЕРЫКА...


ВОСЬ ПАГЛЯДЗІШ НА ЦЯБЕ, КАЛІ ЛАСКА – ЗНЕШНАСЦЬ І ШЭСЦЬ ПАКЕТАЎ З АДЗЕЖАЙ І ТЫ ЯК МАДЭЛЬ КЕЛЬВІНА КЛЯЙНА, АДНАК, ВАРТА ТАБЕ АДКРЫЦЬ РОТ – І ТЫ ЎЖО ЗДАЕШСЯ ТАКІМ ЖА СТАРАДАЎНІМ, ЯК МОЙ СТАРЫ БАЦЬКА.
КАЛІ КАЗАЦЬ ШЧЫРА, Я, ПЭЎНА, ЛЕТ НА ДЗЕСЯЦЬ СТАРЭЙШЫ ЗА ТВАЙНО БАЦЬКУ, ДЖЭН.
І ГЭТА ПУЖАЕ.
ДЫК ЯК ІДУЦЬ СПРАВЫ З ТВАЁЙ БЫЛОЙ НЯВЕСТАЙ? ЯНА ЗГАДЗІЛАСЯ НА РАЗМОВУ ПА ТЭЛЕФОНУ?
ДАРЭЧЫ, У ТУЮ НОЧ МЫ З БАКІ ПАСЯДЗЕЛІ, АБ ЎСІМ ПАРАЗМАЎЛЯЛІ. І ЁН СКАЗАЎ, ШТО ГЭЙЛ ДАЛУЧЫЦЦА ДА НАС, КАЛІ МЫ Ў ХУТКІМ ЧАСЕ ЗНОЎ СУСТРЭНЕМСЯ ПІЎКА ПАПІЦЬ.
ПРАЧНУЦЦА ПАСЛЯ ПЯЦІДЗЕСЯЦІГАДОВАГА СНА І ЗНАЙСЦІ, ШТО САМЫ БЛІЗКІ СЯБАР ЖАНАТЫ НА ВАШАЙ НЯВЕСЦЕ – Я Б НЕ ЗМАГЛА ГЭТА ПЕРАЖЫЦЬ. АЛЕ ДЛЯ БАКІ І ГЕЙЛ ГЭТА БЫЛО ЯШЧЭ ЦЯЖЭЙ.
SMITH BUILDING
КАЛІ ТЫ КАЖАШ КАМУСЬЦІ, ШТО КАХАЕШ, А ПОТЫМ НАПРАЦЯГУ ПЯЦІДЗЕСЯЦІ ГАДОЎ ЗВЫКАЕШСЯ З ДУМКАЙ, ШТО ЁН МЁРТВЫ, ТАДЫ НІЧОГА НЕ ЗРОБІШ.
ШТО Ж, Я ЛІЧУ, Ф'ЮРЫ МАЕ РАЦЫЮ. І ЛЕПШ ЗА ЎСЁ ЗРАБІЦЬ УСЁ ГЭТА СПАКОЙНА І НЕ СПЯШАЮЧЫСЯ, КЭП. ГЭТА ДАПАМОЖА ПРАЖЫЦЬ КАЛЯ СТАРОГА АРМЕЙСКАГА ПРЫЯЦЕЛЯ, ТАКСАМА...
25


...АЛЕ ТЫ МОГ БЫ АРЭНДАВАЦЬ КВАТЭРУ ДЗЕ-НЕБУДЗЬ НАД СУПЕР-МАРКЕТАМ, ТЫМ БОЛЬШ З ТАКІМІ ГРАШАМІ, ЯКІЯ ТАБЕ ПЛАЦЯЦЬ У АЛЬЦІМЭЙТС.
ШЭСЦЬСОТ БАКСАЎ У МЕСЯЦ ЗА АДНАПАКАЁЎКУ – БОЛЬШ ЧЫМ ДАСТАТКОВА, ДЗЯКУЙ, МІС ПІМ.
АКРАМЯ ТАГО, Я ПРАЖЫЎ ПОБАЧ З ТАКІМ МЕСЦАМ. Я НЕ ЗБІРАЮСЯ КІНУЦЬ УСЁ І З'ЕХАЦЬ ТОЛЬКІ ТАМУ, ШТО ХТОСЬЦІ ЎЯЎЛЯЕ ПРА СЯБЕ І СОЎКАЕЦЦА КАЛЯ ДЗВЯРЭЙ.
ДОБРА, СПАДЗЯЮСЯ, ШТО ТЫ ІНВЕСЦІРАВАЎ ЧАСТКУ ТЫХ ГРОШАЎ, ЯКІЯ ТЫ НЕ ЛЮБІШ РАС-ТРАЧВАЦЬ НА БУЙНЫЯ, ДУЖЫЯ ЗАМКІ.
ЭХ, СЦІЎ...



Трыкселіён:
КВАТЭРУ СЦІВА РОДЖЭРСА ЎЗЛАМАЛІ? ХТО Б ГЭТА МОГ ЗРАБІЦЬ, БРУС: АРАБЫ ЦІ КІТАЙЦЫ?
ЁН ЛІЧЫЦЬ, ШТО ГЭТА БЫЛІ ПРОСТА ДЗЕЦІ, ЯКІЯ ЖЫВУЦЬ ПРАЗ ВУЛІЦУ, І ЁН ЎЖО ЯК РАЗ ПАЙШОЎ РАЗБІРАЦЦА НАКОНТ ГЭТАГА, БЭЦІ.
БЕДНЫ КЭП. УВЕСЬ МІНУЛЫ ТЫДЗЕНЬ ЁН ПРАВЁЎ У ТРЭЙЛЕРЫ РАЗАМ СА СВАЁЙ РЭКОР-ДНАЙ КАЛЕКЦЫЯЙ, ПАКУЛЬ АДЗІН ЗЛАСЛІВЫ ТЫП НЕ АБЛІЎ УСЁ ТАМ АЦЭТОНАМ.
КРЫЎДНА ПРА ГЭТА ЧУЦЬ, ГЭТА САПРАЎДЫ ТРАГІЧНА, ДОКТАР БА-НЭР, АЛЕ ЗАРАЗ Я МАЛА ЗАЦІКАЎЛЕНА ГЭТЫМ. ПА ТБ ПАКАЗАЛІ РОЛІК ПРА ТОЕ, ШТО НІХТО НЕ ЗАКЛАПОЧАНЫ ГЭТАЙ ГІСТОРЫЯЙ.
ТАААК, СТАРК У КОСМАСЕ, Ф'ЮРЫ КАЗАЎ ПРА СУ-СТРЭЧУ З ЧЭЙНІ* І ЦЯПЕР КАПІТАН АМЕРЫКА І АСА АДРЫВАЮЦЦА ПАД ГЛУ-ПЫЯ АЛЬБОМЫ ФРЭНКА СІНАТРЫ.
*ЧЭЙНІ – ВІЦЭ-ПРЭЗІДЭНТ ЗША.
СМІ ВЕЛЬМІ ЗАЦІКАЎЛЕНЫ Ў ТЫМ, ШТО МЫ ЗБІРАЕМ КАМАНДУ, У ЯКОЙ ЁСЦЬ ТАКІ ГЕРОЙ ЯК ВОЛАТ.
ДОБРА, ЦЯПЕР МЫ ПАСПРАБУЕМ СТРЭЛІЦЬ ПА ВАШАЙ ГАЛАВЕ З АДНОЙ З ТЫХ ГАРМАТ, ДОКТАР ПІМ.
ШЧЫРА КАЖУЧЫ, ЯНЫ ВЫГЛЯДА-ЮЦЬ МОЦНЫМІ, ХЛОПЦЫ. ШТО КАЛІ ТОЛЬКІ Ў СПІНУ?


БОЖА, БРУС. НЯЎЖО ДОБРА ТАКІМ ЖА ЧЫНАМ ПАНІЖАЦЬ У РАНГУ ХЭНКА І ДЖАНЭТ ПІМ, БЕЗ МАГЧЫМАСЦІ ПРАЦАВАЦЬ НАД НОВЫМ СУПЕРСАЛДАТАМ?
ТЫ ПАВІНЕН СПЫНІЦЬ ПРАЦУ НАД СЫРОВАТ-КАЙ СУПЕРСАЛДАТА КЭПА.
АБ ЧЫМ ГЭТА ТЫ, БЭЦЦІ?
ГЭТА Я СТРАЦІЎ СВАЮ ДУМКУ.
І ЯКОГА ЛЕСУНА ЗДАРЫ-ЛАСЯ З ТЫМ АЛІМПІЙСКІМ СТРАЛЬЦОМ, ЯКО-ГА Ф'ЮРЫ ЗАПІСАЎ НА МІНУЛЫМ ТЫДНІ? Я ЛІЧЫЛА, ШТО САКАЛІНАЕ ВОКА, ЯК ПЛАНАВАЛАСЯ, З'ЯВІЦЦА СЁННЯ.
МММ, ЁН АДПАЧЫВАЕ НА МАЛЬДЗІВАХ. ЁН СКАЗАЎ, ШТО ГЭТА АДЗІНЫ ТЫДЗЕНЬ, КАЛІ ЯГО СЯБРОЎКА МОЖА ВЫЙСЦІ З РАБОТЫ І ПАКОЛЬКІ ГЭТА НЕ ВЫКЛІКАЛА НІЯКІХ ТЭХНІЧНЫХ...
О, ДЗЕЛЯ БОГА. ХАКІ ГАТО-ВЫЯ З'ЕСЦІ НАС ЖЫЎЦОМ ЗА ГЭТА, ПРЫТЫРАК. Я ЛІЧЫЛА, ПАКОЛЬКІ ТЫ РАЗ-УМНЫ, З ГЭТЫМ ТЫ МОГ БЫ РАЗАБРАЦЦА САМ.
ПРАБАЧ...
ШТО Ж, ПРАБАЧЭННІ БОЛЬШ НЕ ПРЫМАЮЦ-ЦА. ЗАКОНЧЫШ З ГЭТЫМ?
ТОЛЬКІ ПЕРАКА-НАЙСЯ, ШТО Ф'ЮРЫ АТРЫМАЕ ТОРА Ў КАМАНДУ ВЕЧАРАМ ЦІ ГЭТА ЗАТРЫМ-КА З ПАПАЎНЕННЕМ ГЕРОЯЎ У КАМАН-ДУ ЗАЦЯГНЕЦЦА НАДОЎГА.


Нарвегія:


ХТОСЬЦІ НЕ АДКАЗАЎ НА МАЕ ТЭЛЕФОННЫ ЗВАНКІ.
ТАДЫ, МАГЧЫМА, ГЭТАГА «КАГОСЬЦІ» ЗУСІМ НЕ ЦІКАВІЦЬ НІЧОГА З ТАГО, АБ ЧЫМ ВЫ ГАВОРЫЦЕ, НІКАЛАС Ф'ЮРЫ.
Я СПАДЗЯЮСЯ, ТЫ ТУТ НЕ ДЛЯ ТАГО, КАБ АРЫШТАВАЦЬ НАС ЗА ДАЧЫНЕННЕ ДА СУСВЕТНЫХ ГАНДЛЁВЫХ ПРАТЭСТАЎ, ГЕНЕРАЛ.
ЯК ЗАЎСЁДЫ, ВЫШЫ ПРЫШЧЫПЕНЦЫ Ў СМІ АБСАЛЮТНА НЕДАКЛАДНА ПЕРАДАЛІ ТОЕ, ШТО БЫЛО МІРНАЙ ДЭМАНСТРАЦЫЯЙ.
ТОР, КАЛІ Б Я ЫБЫЎ ТУТ ДЗЕЛЯ ТАГО, КАБ АРЫШТАВАЦЬ ЦЯБЕ, ТАДЫ Б Я НАЎРАД ЦІ ЎЗЯЎ З САБОЙ ТОЛЬКІ КІРАЎНІЦТВА Ш.Ч.Ы.Т.А І ПРОСТЫ ШВЕЙЦАРСКІ АРМЕЙСКІ НОЖ.
АХ, ТАДЫ, НАПЭЎНА, ТЫ ТУТ З ПРЫВАБНАЙ ПРАПАНОВАЙ ПАСТРЫГЦІ МЯНЕ І ЗАПІСАЦЬ У МАРСКУЮ ПЯХОТУ ЗША, ТАК?
АЛЦІМЭЙТС НЕ АРМІЯ, МІСТАР. ЯНЫ – КАМАНДА ГЕРОЯЎ НАЙВЫСШАЙ ЯКАСЦІ, ЯКІХ МЫ САБРАЛІ, КАБ КЛАПАЦІЦЦА АБ ПРАБЛЕМАХ ПРОСТЫХ ГРАМАДЗЯН, З ЯКІМІ ЎЗБРОЕНЫЯ СІЛЫ НЕ ЗЛАДЗЯЦЬ.
О, НЕ МАЕ ЗНАЧЭННЫ, ЦІ НОСІЦЕ ВЫ ТАПКІ ЦІ БАЯВЫЯ БУТСЫ, ЧАЛАВЕЧЫК. ВЫ ЎСЕ – УРВІЦЕЛІ ВА ЎНІФОРМЕ, ЯКІЯ РАЗГРАМЯЦЬ ЛЮБУЮ ПАГРОЗУ ПРАВАЛА ГАНДЛЮ.


АДПРАЎЛЯЙЦЕСЯ ДА СВАІХ «СПОНСАРАЎ» І ПЕРАДАЙЦЕ, ШТО СЫНА ОДЗІНА НЕ ЦІКАВІЦЬ ПРАЦА У ВАЕННЫМ ІНДУСТРЫЯЛЬНЫМ КОМПЛЕКСЕ, ЯКІ ПРАЕКТУЕ ВАЙНУ І ЗАБІВАЕ НЯВІННЫХ.
ВАС МОЖНА ПАЛІЧЫЦЬ СУПЕРЗЛОДЗЕЕМ, ПАБАЧЫЦЕ Ў БЛІЖЭЙШЫ ЧАС, КАЛІ ВАС НАКІРУЮЦЬ ЗАБІВАЦЬ ДЗЕЛЯ НАФТЫ ЦІ СВАБОДНАГА ГАНДЛЮ.
ОХ, ВЫДАТНА. ЛЮДЗІ, ДЫ ЯК ВЫ МОЖАЦЕ ПРОСТА СЯДЗЕЦЬ ТУТ І СЛУХАЦЬ УСЁ ГЭТА ЛАЙНО, ШТО НЯСЕ ГЭТЫ «СЫН ОДЗІНА»?
СУПАКОЙСЯ, БАНЭР...
НЕ, ГЭТЫЯ ЛЮДЗІ МАЮЦЬ ПРАВА ВЕДАЦЬ ХЛОПЦА, ЗА ЯКІМ ЯНЫ ІДУЦЬ, ГЭТА ПРЫБЛІЗНА ВАР'ЯЦКІ ПСІХ, ГЕНЕРАЛ.
ТЫ НЕ НОВЫ МЕСІЯ. ТЫ ЎСЯГО ТОЛЬКІ ЗВАР'ЯЦЕЛЫ НЕЎРОТЫК, ЯКІ САРВАЎСЯ ТРЫ ТЫДНІ НАЗАД І ПРАВЁЎ ВАСЕМНАЦЦАЦЬ МЕСЯЦАЎ У ДОМЕ ДЛЯ ДУШЭЎНАХВОРЫХ.
ТЫ МОГ БЫ АДХАПІЦЬ САБЕ ВЯЛІКІЯ ГРОШЫ, ВЫСТУПАЮЧЫ З ЛЕКЦЫЯМІ І ПУБЛІКУЮЧЫ ЛУХТУ ПРА САМАЎДАСКАНАЛЕННЕ, АЛЕ ТЫ МЯНЕ НЕ ПАДМАНІШ ЗА ТАКІ КАРОТКІ ЧАС; Я ВЕДАЮ ЎСЕ ТВАЕ ТАЙНЫ.
А Я ВЕДАЮ ТВАЕ ТАЙНЫ, ДОКТАР БАНЭР.
ТЫ СКАЗАЎ БЭЦЦІ РОС, ШТО ПЛАЧАШ У АДЗІНОЦТВЕ КОЖНУЮ НОЧ ЦІ ТЫ ЗАНЯТЫ ТЫМ, ШТО ПРЫДУМВАЕШ, ЯК БЫ НАШКОДЗІЦЬ ПІМАМ, КАБ ВЫКРАСЦЬ СВАЮ СТАРУЮ ПРАЦУ?
ШТО?
ГЭТА МАГЧЫМАСЦІ НЕ МУТАНТА І НЕ МАШЫНЫ, СМЯРОТНЫ. КАЛІ Ж ДЭМАНСТРАЦЫЯ МЬЁЛНІРА ГЭТА ТОЕ, ШТО ТЫ ТАК ХОЧАШ, ТАДЫ Я АШЧАСЛІЎЛЮ ЦЯБЕ.



А ШТО НАКОНТ ТАГО 60-ХВІЛІННАГА ІНТЭРВ'Ю, ЯКОЕ ТЫ ДАВАЎ, ТОР? Я ДУМАЎ, ШТО ТЫ ТУТ, КАБ ВЫРАТАВАЦЬ СВЕТ.
О, Я ТУТ, КАБ ВЫРАТАВАЦЬ СВЕТ, ГЕНЕРАЛ Ф'ЮРЫ.
ВЫРАТАВАЦЬ АД ТАКІХ, ЯК ТЫ.
ДАВАЙ, БАНЭР, ПОЙДЗЕМ.
МЫ ТОЛЬКІ ДАРЭМНА МАРНУЕМ ЧАС.


Праз тыдзень
Пакой для адпачынку:
ШТО Ж, НІ ТОРА, НІ СЫРОВАТКІ СУПЕРСАЛДАТА, НІ НАВАТ СУПЕРЗЛОДЗЕЯ, КАБ ПЕРАМАГЧЫ ЯГО, СПАДАРЫ.
Б'ЮСЯ АБ ЗАКЛАД, КАЛІ Б ГЭТА НЕ БЫЛО ДЛЯ ДВУХГАДОВАЙ ГАНДЛЁВАЙ КАМПАНІІ СТАРКА, ЯКОЙ НАС ПАВЯЗАЛІ, ТАДЫ Б НА НАС ДАЎНО МАХНУЛІ Б РУКОЙ.
ГЭЙ, ВЫ ЧУЛІ, ШТО ПРА ВАС ХОЧУЦЬ ЗНЯЦЬ ФІЛЬМ? БЭЦЦІ РОС КАЗАЛА, ШТО ЯНЫ ЎЖО ВЯДУЦЬ ПЕРАМОВЫ З БРЭДАМ ПІТАМ ПРА ЯГО РОЛЮ КАПІТАНА АМЕРЫКА Ў ТРОХ ЧАСТКАХ.
ХТО ТАКІ БРЭД ПІТ?
ШТО, ТЫ СУР'ЁЗНА? БОЖА. НУ ГЭТА ЎЖО І СТРАШНА, У РЭШЦЕ РЭШТ? ЯК ТЫ ЛІЧЫШ, А КАГО ВОЗЬМУЦЬ НА ТВАЮ РОЛЮ, НІК?
БЕЗСУМНЕЎНА ГЭТА БУДЗЕ СЭМЮЭЛЬ ДЖЭКСАН. ПРА ГЭТА НАВАТ СПРАЧАЦЦА НЯ ВАРТА, ДОКТАР ПІМ.


А ЦЯПЕР Я ВАМ СКАЖУ, ХТО ЗМОГ БЫ ВЫДАТНА ЗГУЛЯЦЬ ТОНІ СТАРКА – ГЭТА ЧОРТАВЫ ДЖОНІ ДЭП.
ШТО? ДЭП ЗАНАДТА ЮНАЦКІ ДЛЯ ГЭТАЙ ГІСТОРЫІ. У СТАРКА ЗВАР'ЯЦЕЛЫ ХАРАКТАР, ЯК У ГОВАРДА Х'ЮЗА. Я ЖАДАЛА Б БАЧЫЦЬ ЯГО Ў БОЛЬШ ЭКСЦЭНТРЫЧНЫМ АБЛІЧЧЫ.
НЯ ВАРТА НЕДААЦЭНЬВАЦЬ ДЭПА, МІС ПІМ. МНОГІЯ СТАВЯЦЬ НА ЯГО ЦЭТЛІК СЛАБОГА ХЛОПЧЫКА, АЛЕ ЁН НА ДАДЗЕНЫ МОМАНТ З'ЯЎЛЯЕЦЦА АДНЫМ З САМЫХ ДАСВЕДЧАНЫХ АКТОРАЎ У ГАЛІВУДЗЕ.
КАЛІ ФІЛЬМ ЗДЫМЕ ЭД ВУД, ТАДЫ МЫ АТРЫМАЕМ ЖАЛЕЗНАГА ЧАЛАВЕКА НА ПАПЕРЫ, ДАРАЖЭНЬКАЯ.
Я БЫ ПАГЛЯДЗЕЎ НА ГЭТА.
ВЕДАЕШ, ТЫ, ВІДАЦЬ АТРЫМАЎ ПАЦЕШНУЮ ТЭМКУ ДЛЯ АБМЕРКАВАННЯ, НІК. А ЯК ТЫ ЛІЧЫШ, КАГО ПАЗНАЧАЦЬ НА МАЮ РОЛЮ?
О, ГЭТА ПРОСТА. МЭЦЬЮ МАККОНАХІ З З ЗАПАЛЫМІ ШЧОКАМІ, КАНЕШНЕ.
А МЯНЕ ХТО?
ХЕХ, ХТО ЯШЧЭ, ЯК НЕ МІС ЛЮСІ ЛЬЮ?
А, НУ ДА. НАВАТ НЕ ПАДУМАЎ, ШТО ЯНА БУЙНЕЙ МЯНЕ І ЗУСІМ НЕ ПАДОБНА, БО ДЛЯ ВАС УСЕ АЗІЯТЫ НА АДЗІН ТВАР, ТАК ЖА?
А КАГО НА МАЮ РОЛЮ НАЗНАЧАЦЬ ДУБЛЁРАМ, ГЕНЕРАЛ? БРУСА ЛІ?


ХТО ТАКІ БРУС ЛІ?
ПАЧАКАЙЦЕ. А ВЕДАЕЦЕ, ХТО БЛІСКУЧА ЗГУЛЯЎ БЫ БРУСА БАНЭРА? АДЗІН ХЛОПЕЦ, ЯКІ ЗМОГ БЫ ЗЛАДЗІЦЬ З РОЛЯЙ ЗЯЛЁНАСКУРАГА НЕЎРОТЫКА, ПЕРАЎТВАРЫЦЦА Ў ЯГО КОПІЮ Ў КІНО?
ПАСПРАБУЮ АДГАДАЦЬ: ВУДЗІ АЛЕН, КАЛІ ЁН СКІНЕ НЕКАЛЬКІ КІЛАГРАМЧЫКАЎ? ТОЙ ЖАХ, МАЛЕНЬКАЕ ДЗІЦЯ З ФІЛЬМА «ШОСТАЕ ПАЧУЦЦЁ»?
НЕ, НЕ. ТАЯ МЫШ – ДЖЫНА ДЭВІС. ЯК ТАМ ЯГО, ЧОРТ БЯРЫ, «СЦЮАРТ ЛІТЛ»?
Я СУР'ЁЗНА, РАБЯТЫ. ВЕДАЕЦЕ, ХТО ЗМОГ БЫ ЗГУЛЯЦЬ БАНЭРА ЛЕПШ, ЧЫМ САМ БАНЭР?..
МММ, ХЭНК. ТЫ НЕ МОГ БЫ ЗАКРЫЦЬ РОТ...
Я ХАЦЕЎ НАЗВАЦЬ СЦІВА БУШЭМІ. ШТО Ў ГЭТЫМ ДРЭННАГА?



Манхэттан:
SAMSUNG
SUNTORY
БЭЦЦІ? БОЖА, ДЗЯКУЙ, ШТО ТВОЙ ТЭЛЕФОН НЕ АДКЛЮЧАНЫ ЦІ ЯШЧЭ ШТО-НЕБУДЗЬ. ЁСЦЬ НЕШТА, АБ ЧЫМ Я ПАВІНЕН СКА-ЗАЦЬ ТАБЕ, ДАРАГУША. НЕШТА САПРАЎДЫ ВАЖНАЕ...
БРУС? ГЭТА ТЫ? СЛУХАЙ, Я САПРАЎДЫ НЕ МАГУ РАЗМАЎЛЯЦЬ ЗАРАЗ. Я АБЕДАЮ З ФРЭДЗІ ПРЫНЦ МАЛОДШЫМ.
МЫ ПАЧАЛІ АБМЯРКОЎВАЦЬ, ХТО ЗГУЛЯЕ ЖАЛЕЗНАГА ЧАЛАВЕКА, АЛЕ КАЛІ Я СКАЗАЛА ЯМУ ПРА СЫРОВАТКУ СУПЕРСАЛДАТА, ЯКУЮ ТЫ ХАЦЕЎ УЗЛАМАЦЬ, ЁН СКАЗАЎ, ШТО ХОЧА ЗІРНУЦЬ НА ГЭТА.
Я НЕ ЖАРТУЮ, БРУС, ГЭТЫ ХЛОПЕЦ ХОЧА СТАЦЬ АКТОРАМ СУСВЕТНАГА МАСШТАБУ, ЯК НІКАЛАС КЕЙДЖ.
БЭЦЦІ, ПАМАЎЧЫ! У НАС ВЕЛЬМІ МАЛА ЧАСУ. Я ЗНОЎ ЗРАБІЎ НЕШТА ВЕЛЬМІ ДРЭННАЕ, І, ЛІЧУ, ШТО ТЫ ЗНАХОДЗІШСЯ Ў ВЯЛІКАЙ НЕБЯСПЕЦЫ, ДАРАГАЯ.
ПРАБАЧ, ШТО?


БРУС, Я ХАЧУ, КАБ ТЫ СУПАКОІЎСЯ І СКАЗАЎ МНЕ ДА-КЛАДНА, ШТО ТЫ ЗРАБІЎ, ДОБРА?
ЯК ТОЛЬКІ Я ЗРАЗУМЕЎ, ШТО НЕ ЗМАГУ ЎЗЛАМАЦЬ ФОРМУЛУ, Я ЗМЯШАЎ КРОЎ КЭПА СА ЎСЁЙ ГЭТАЙ ХЕЎРАЙ І ВВЁЎ У СВАЮ ГАЛОЎНУЮ ВЕНУ, БЭЦЦІ.
ШТО? ЧАМУ ТЫ ГЭТА ЗРАБІЎ?
НУ, Я ГЭТА ПАТЛУМАЧУ ТЫМ, ШТО КАЛІ СТАНУ МОНСТРАМ, ЗМАГУ ПАКА-ЗАЦЬ КАМАНДЗЕ УСЮ СВАЮ МОЦ, ПАСПРАБАВАЦЬ ЗМА-ГАЦЦА РАЗАМ, І БАРАЦЬБА ГЭТА БУДЗЕ АДЗІНЫМ СПО-САБАМ ДАКАЗАЦЬ СІЛУ...
КЛЯНУСЯ ЎСІМ СВЯ-ТЫМ, Я СПРАБАВАЎ ПАЗБЕГНУЦЬ ГЭТАГА.
БРУС?
BRUCE?!


MERCY
НЕВЯДОМЫ МУЖЧЫНА, СПЫНЕННЕ СЭРЦА. ПРЫБЛІЗНЫ ЧАС ПРЫБЫЦЦЯ ДЗЕСЯЦЬ-ПЯТНАЦЦАЦЬ ХВІЛІН. ПЕРАКАНАЙСЯ, ШТО ТЫ ЗРАБІЛА МНЕ КАВУ, АЛОРЭС, ГЭТА МОЙ АПОШНІ НА СЁННЯ ВЫЯЗД.
РАЗРАД НА ДЗВЕСЦІ, ЭНДЗІ. ПАЎТОРНА.
РАЗРАД НА ДЗВЕСЦІ!
НЯМА НІЯКАЙ РЭАКЦЫІ, ЭМАН.
ДОБРА, ДОБРА. ТАКОЕ БЫВАЕ, ХЛОПЕЦ. СПАКОЙНА. РАЗРАД НА ТРЫСТА ШЭСЦЬДЗЕСЯТ. АСЦЯРОЖНЕЙ.


ТАК САМА НІЧОГА, БОС. ГЭТЫ ХЛОПЕЦ ЦАЛКАМ ВЫРУБІЎСЯ. ЯКОГА ЛЯСУНА ЁН ТАМ РАБІЎ?
НЕ МАЕ ЗНАЧЭННЯ. ТОЛЬКІ АТРЫМАЙ НАРМАЛЬНУЮ ЛІНІЮ І ПРАВЕР ЯГО РЭФЛЕКСЫ. ДЖО, ЦІ НЕ МАГЧЫМА РАЗАГНАЦЬ ГЭТУЮ КАЛЫМАГУ ХУТЧЭЙ, ЧЫМ ДЗЕСЯЦЬ МІЛЬ У ГАДЗІНУ?
BETTY!
ЧОРТ БЫ ПАБРАЎ!!! ШТО ЗА..?
СУПАКОЙ ЯГО І ЎВЯДЗІ ТРАНКВІЛІЗАТАР, ЭНДЗІ! ЁН НАМ УСЁ РАЗНЯСЕ ТУТ І НАШКОДЗІЦЬ У ДАДАТАК САБЕ!
Я НЕ МАГУ ГЭТА ЗРАБІЦЬ ЗАРАЗ! ГЭТЫ КАРЛІК МАЦНЕЙ, ЧЫМ ЗДАЕЦЦА...


NO SMOKING
ШТО ВЫ ТАМ РОБІЦЕ?
ШТО ТАМ У ВАС?
ПРЭЧ З ДАРОГІ, ЛАЙНЮКІ!
ХАЛКУ ПАТРЭБНЫ ФРЭДДЗІ ПРЫНЦ МАЛОДШЫ!


ПЕРШАЯ КАМАНДА ДА ТРЫНАЦЦАТАГА АНГАРА, У ПОЎНЫМ БАЯВЫМ СТАНЕ!
ДРУГАЯ КАМАНДА ДА АНГАРА ДВАНАЦЦАЦЬ, ТРЭЦЦЯЯ КАМАНДА ДА ПЕРШАГА АНГАРА ПРАЗ АДЗІНАЦЦАТЫ...
ГЭТА ЎСЁ З-ЗА ЦЯБЕ, ХЭНК. ТЫ ПАВІНЕН БЫЎ ПАЙСЦІ І СКАЗАЦЬ, ШТО ЁН ПАДОБНЫ НА СЦІВА БУШЭМІ.
НЕ ТАЛДЫЧ ТАМ ЗА МАЁЙ СПІНОЙ. НА САМ РЭЧ ГЭТА ТЫ ПАЧАЛА СМЯЯЦЦА З ВУДЗІ АЛЕНА.
СЛУХАЙЦЕ, МНЕ АДНАГО МЕСЦА, ХТО ШТО СКАЗАЎ. УСЁ, ШТО Я ВЕДАЮ ПРА ГЭТУ СІТУАЦЫЮ, ШТО АДЗІН З НАС ПАТРАПІЎ У БЯДУ І НАМ ТРЭБА ЎЖО ПРЫДУМАЦЬ СУМЕСНЫ ПЛАН ДЗЕЯННЯЎ.
ПЛАН ВЕЛЬМІ НАВАТ ПРОСТЫ, ТОНІ...


ТРЭБА СПЫНІЦЬ ХАЛКА.